*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 24 (302) | Пятніца, 25 кастрычніка 1957 года | Цана 20 кап.

## НАДЗЁННЫЯ ПЫТАННІ ПАРТЫЙНАГА ЖЫЦЦЯ

Справаздачна-выбарчыя сходы у партыйных арганізацыях факультэтаў прайшлі на высокім ідэйным узроўні. Ім папярэднічала значная падрыхтоўчая праца, зробленая партыйнымі бюро. Станоўчым бокам усіх сходаў была высокая актыўнасць комуністаў. Аб гэтым гаворыць той факт, што у спрэчках на партыйных сходах выступіла больш 60 членаў і кандыдатаў партыі, якія па-дзелавому аналізавалі работу партыйных бюро, указвалі на дасягненні, канцэнтравалі увагу на недахопах, уносячы канкрэтныя прапановы па іх ліквідацыі.

Партыйныя сходы паказалі сталасць і боездольнасць факультэцкіх арганізацый, якія правільна разумеюць свае задачы і актыўна працуюць над іх пераўтварэннем у жыццё. Значная праца за справаздачны перыяд была зроблена партыйнымі арганізацыямі геафака (былы сакратар І. І. Трухан), біяфака (былы сакратар А. І. Палілаў). Комуністы усіх факультэтаў добрасумленна працуюць над падрыхтоўкай высокакваліфікаваных, усебакова адукаваных і ідэйна выхаваных спецыялістаў для розных галін народнай гаспадаркі і культуры. На партыйных сходах комуністы добра адклікаліся аб рабоце комуністаў тт. Паўлючэнка, Ермоленка, Баркана, Савачкіна, Дарогіна, Зяцькова, Янкоўскага, Лук'янцавай, Сікорскага, Захаравай і многіх іншых таварышоў.

Агульным недахопам на ўсіх факультэтах, як паказалі сходы, з'яўляецца пасіўнасць комсамольскіх арганізацый. Адзначаючы станоўчыя бакі у рабоце комсамола, выступаўшыя комуністы падкрэслівалі слабую палітычную і працоўную актыўнасць многіх комсамольцаў, якія усё яшчэ недобрасумленна адносяцца да вучобы, парушаюць дысцыпліну, не берагуць агульнанародную маёмасць, не адзначаюцца руплівасцю ў быце. Між тым, комсамольскія бюро і камітэт не прымалі дзейсных мер да таго, каб зжываць маючыяся недахопы і ўзняць узровень комсамольскай работы. Комуністы указвалі таксама і на тое, што партыйныя бюро не заўсёды аказвалі неабходную дапамогу комсамольскім арганізацыям на факультэтах.

Многія комуністы звярнулі сур'ёзную увагу на неабходнасць паляпшэння спартыўна-масавай работы на факультэтах. Комуністы філфака гаварылі аб тым, што у паляпшэнні гэтай работы многае маглі-б зрабіць комуністы спецкафедры. У сувязі з гэтым было узнята пытанне аб замацаванні членаў спецкафедры па факультэцкіх партыйных арганізацыях. Такія-ж прапановы вылучаліся і на партсходах іншых факультэтаў.

Вельмі сур'ёзную заўвагу ў адрас парткома зрабілі комуністы геафака. Яны крытыкавалі стыль работы парткома, які безупынна засядае, у многіх пытаннях падмяняе факультэцкія партыйныя, комсамольскія, профсаюзныя і іншыя грамадскія арганізацыі. Выклікаючы вельмі часта на свае паседжанні сакратароў партыйных арганізацый, партком тым самым адрывае іх ад непасрэднай работы сярод мас. Аб гэтым гаварылася і на сходах другіх факультэтаў.

Крытыку трэба прызнаць правільнай. Вынікі работы парткома і партыйных бюро маглі быць значна лепшымі, калі-б іх члены больш працавалі непасрэдна з людзьмі на факультэтах, курсах, у гуртках і інтэрнатах. У рабоце парткома сапраўды пераўважае такая форма работы, як паседжанні, на якіх кожны раз разглядаецца нямала самых разнастайных пытанняў. Карысці было-б значна больш, калі-б многія з гэтых пытанняў разглядаліся рэктаратам, партыйнымі арганізацыямі факультэтаў, камітэтам комсамола, прафкомам, мясцкомам, мастацкім советам, камітэтам ДТСААФ.

Цэнтр увагі трэба накіраваць на кантроль за своечасовым выкананнем прынятых рашэнняў. Напрыклад, па пытанню правядзення падпіскі на перыядычны друк на працягу года прымалася некалькі рашэнняў, а з падпіскай па-ранейшаму справа абстаіць дрэнна. Так, 4 кастрычніка на хімфаку яшчэ не было падпісных лістоў, а пачалася падпіска 1-га.

Прайшоўшыя справаздачна-выбарчыя сходы паказалі, што факультэцкія партыйныя арганізацыі ужо набылі некаторы вопыт партыйнай работы і цалкам здольны паспяхова вырашаць стаячыя перад імі задачы. Парткому трэба сістэматычна удасканальваць свае формы і метады кіраўніцтва, усімі сіламі заахвочваць і развіваць творчую ініцыятыву партыйных бюро, штодзённа дапамагаць ім у рабоце. Інтарэсы справы патрабуюць таксама праяўляць больш клопатаў аб комсамоле, умела падбіраць і выхоўваць комсамольскія кадры.

**І. М. ІГНАЦЕНКА,**
намеснік сакратара парткома БДУ.

## Мая мара ажыццявілася!

Ва універсітэт я прыйшла зусім нядаўна. Яшчэ тры месяцы назад я працавала на Мінскім радыёзаводзе. Два гады вучобы у рамесленым вучылішчы далі мне спецыяльнасць радыёмантажніцы. Цікавая і захапляючая спецыяльнасць, і я вельмі палюбіла яе.

Але жаданне паступіць у ВНУ не пакідала мяне. Працуючы на заводзе, я закончыла вячэрнюю школу рабочай моладзі. І вось я, студэнтка 1 курса фізіка-матэматычнага факультэта БДУ, з захапленнем слухаю лекцыі кваліфікаваных выкладчыкаў універсітэта.

Мая мара ажыццявілася!

*Л. ВЕЛІЧКА,*
*студэнтка 1 курса фізмата.*

# ІДУЦЬ ЗАНЯТКІ Ў СЕТЦЫ ПАРТЫЙНАЙ АСВЕТЫ

### Праводзяць заняткі творча

На працягу раду год на фізіка-матэматычным і хімічным факультэтах працуе філасофскі семінар. Удзельнікамі семінара з'яўляюцца многія работнікі названых факультэтаў. Па словах саміх удзельнікаў, семінар прыносіць ім вялікую карысць.

1 кастрычніка семінар пачаў свой новы навучальны год. На гэтым занятку была абмеркавана праграма работы, намечаны дакладчыкі па важнейшых праблемах. У ліку тэм, абраных для вывучэння, — актуальныя метадалагічныя праблемы фізікі, хіміі, матэматыкі.

Бліжэйшыя два заняткі будуць прысвечаны вывучэнню Тэзісаў Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС і Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС «Да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі (1917—1957 гг.)». Задача заключаецца у тым, каб правесці гэтыя заняткі творча, жыва, на высокім ідэйна-палітычным узроўні.

Удзельнікі семінара адносяцца да вучобы з вялікай цікавасцю і добрасумленнасцю, актыўна удзельнічаюць у абмеркаванні вывучаемых пытанняў. Гэта з'яўляецца важнейшай гарантыяй таго, што работа семінара будзе паспяховай і карыснай.

**В. СЦЯПАНАЎ,**
кіраўнік семінара.

### Паглыбляем веды

Пачаўся новы навучальны год у сістэме партыйнай асветы. Сёлета многія работнікі бібліятэкі выказалі жаданне займацца у палітгуртку, якім кіруе тав. Т. А. Базылеў.

Адбылося першае паседжанне палітгуртка. Заняткі пачаліся з гутаркі аб Тэзісах «Да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі (1917—1957 гг.)». У канцы гутаркі Т. А. Базылеў зрабіў кароткія вывады, адказаў на пытанні слухачоў.

Кіраўнік гуртка пазнаёміў слухачоў з планам наступнага субяседвання, указаў пералік дадатковай літаратуры.

Пасля кожнага вывучанага раздзела намечана праводзіць семінары. Гэта дасць магчымасць слухачам самастойна працаваць з першакрыніцамі і такім чынам замацоўваць веды.

Улічваючы узровень падрыхтоўкі слухачоў, наступныя заняткі будуць прысвечаны раздзелам палітычнай эканоміі капіталізма. Вывучэнне даных раздзелаў намечана закончыць да канца бягучага навучальнага года. Вывучэнне эканамічнай тэорыі будзе звязана з вывучэннем канкрэтнай эканомікі.

**Я. ІВАНОЎСКАЯ,**
удзельнік гуртка.

**Вывучаем Тэзісы „Да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі“**

### У філасофскім гуртку

Цікава і арганізавана прайшоў першы семінар філасофскага гуртка геолага-геаграфічнага факультэта. Вывучаліся два першыя раздзелы Тэзісаў Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС і Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС «Да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі (1917—1957 гг.)».

Глыбокія веды матэрыялу паказалі тт. Дземенцьеў, Крышчановіч, Шкляр, Трухан і іншыя. Актыўны удзел у занятках прынялі тт. Коўшар, Раманоўскі, Спірыдонаў.

Семінар прайшоў паспяхова таму, што яму папярэднічала вялікая арганізацыйная праца. Удзельнікі семінара дамовіліся наступнае паседжанне прысвяціць далейшаму вывучэнню Тэзісаў.

**А. КЛЕЎЧЭНЯ.**

### Час прайшоў непрыкметна

Для партыйнай арганізацыі кафедры спецыяльнай падрыхтоўкі мінулы год у сетцы партыйнай асветы азнаменаваўся некаторым паляпшэннем якасці вучобы. Па рашэнню комуністаў у нас быў створан семінар на тэму «Марксізм-ленінізм аб вайне і арміі». Вучоба дапамагла слухачам глыбей авалодаць марксісцка-ленінскай навукай, творча прымяняць яе палажэнні да вучэбнай і выхаваўчай работы са студэнтамі. Таму у бягучым навучальным годзе члены кафедры вырашылі прадоўжыць работу гэтага семінара.

Рыхтуючыся да сустрэчы юбілея Кастрычніцкай рэволюцыі, удзельнікі семінара вырашылі прысвяціць тры заняткі вывучэнню Тэзісаў Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС і Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС «Да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі».

Жыва і цікава прайшлі першыя заняткі. У абмеркаванні пытанняў тэмы прынялі актыўны удзел комуністы тт. Сухаў, Любімаў, Касачоў, Будзько. На семінары завязваліся творчыя дыскусіі аб тым, як трэба разумець сутнасць ленінскага плана ГОЭЛРО, па пытаннях НЭПа і іншых.

Па выступленню комуніста М. А. Сухава узнікла дыскусія аб лозунгах партыі па сялянскаму пытанню. Удзельнікі семінара настолькі захапіліся абмеркаваннем пытанняў, што не заўважылі, як прайшло тры гадзіны, хаця па плану на заняткі адводзілася толькі дзве.

Абмеркаванне Тэзісаў будзе прадаўжацца ў канцы кастрычніка і у лістападзе. У далейшым асноўная увага будзе сканцэнтравана на актуальных пытаннях марксісцка-ленінскай тэорыі аб вайне і арміі, на вывучэнні эканамічнай асновы і характары войн у эпоху імперыялізма і распаду каланіяльнай сістэмы, на высвятленні сутнасці войн, якія праводзяцца у мэтах абароны айчыны.

*А. В. КІРСАНАЎ,*
*кіраўнік семінара.*

### Жыва і цікава

Першыя заняткі тэарэтычнага семінара выкладчыкаў юрыдычнага факультэта былі прысвечаны вывучэнню Тэзісаў Аддзела прапаганды і агітацыі ЦК КПСС і Інстытута марксізма-ленінізма пры ЦК КПСС «Да саракагоддзя Вялікай Кастрычніцкай соцыялістычнай рэволюцыі».

Нягледзячы на арганізацыйныя недахопы, усё-ж першыя заняткі прайшлі цікава і пры высокай актыўнасці ўдзельнікаў.

Асабліва вострыя спрэчкі разгарнуліся па пытанню аб сутнасці совецкай дэмакратыі і яе карэнным адрозненні ад «хваленай» буржуазнай дэмакратыі. Комуністы Юхо, Цішкевіч і старшая лабарантка Дрэкалава, крытыкуючы ілжывасць буржуазных свабод, прывялі шмат фактычных даных з перыядычнай літаратуры, у прыватнасці, нядаўнія падзеі ў Літл-Року.

Пасля заканчэння вывучэння Тэзісаў удзельнікі семінара прыступяць да вывучэння канкрэтнай эканомікі.

**Т. ІВАНОЎ.**



**НА ЗДЫМКУ:** студэнткі IV курса хімічнага факультэта Зіна Бадзілоўская і Таня Галаватая на лабараторных занятках па фізічнай хіміі.

## ПАДЗЯКА КАЛГАСНІКАЎ



*З пачуццём глыбокай падзякі за аказаную дапамогу адклікаюцца калгаснікі сельгасарцелі імя Ільіча Мінскага раёна аб рабоце групы студэнтаў III курса хімічнага факультэта БДУ, якую ўзначаліў аспірант кафедры каталізу В. Мардыкін.*

*Студэнты дапамаглі калгаснікам паспяхова правесці ўборку і абмалот зернявых культур, сабраць і абмалаціць багаты ўраджай ільну, вырыць бурты для засыпкі бульбы на насенне і ўбраць гародніну.*

*Нягледзячы на дрэннае надвор'е, студэнты сістэматычна перавыконвалі дзённыя нормы выпрацоўкі.*

*НА ЗДЫМКУ: Група студэнтаў хімфака на калгасным таку ўбірае ачышчанае зерне яравой пшаніцы для засыпкі ў калгасны свіран на насенне для ўраджаю будучага года.*

*Гэты здымак з удзячнасцю на-днях нам даставіў з калгаса Н. МАРОЗАЎ.*

## Біялагічны факультэт

### НАПЯРЭДАДНІ ЗНАМЯНАЛЬНАЙ ДАТЫ

Падрыхтоўку да саракагоддзя Вялікага Кастрычніка біялагічны факультэт пачаў яшчэ вясной гэтага года. Гэтае пытанне было абмеркавана на партыйным сходзе. На пяці кафедрах падведзены вынікі вучэбнай і навукова-даследчай працы за час свайго існавання.

З абагульняючымі дакладамі аб навуковай дзейнасці кафедр выступаюць відныя вучоныя нашага факультэта прафесары: Т. Н. Годнеў «Аб заключных рэакцыях абразавання хларафіла на святле і цемнаце», І. С. Лупіновіч «Вынікі даследавання глебы за 40 год», Н. В. Трубін «Да пытання аб гетэрозісе», Д. А. Дарожкін «Вынікі фітапаталагічных даследаванняў у БССР за 40 год», Г. Г. Вінберг «Асноўныя напрамкі і вынікі гідрабіялагічных даследаванняў у БССР, праводзімых БДУ імя В. І. Леніна», доктар біялагічных навук І. Н. Сержанін «Даследаванні БДУ па фауне пазваночных жывёл».

Актыўна вядзе падрыхтоўку да свята СНТ факультэта. Рыхтуецца 6 дакладаў, якія будуць прачытаны на навуковай студэнцкай канферэнцыі. Камсамольская арганізацыя факультэта арганізуе рад сустрэч студэнтаў з удзельнікамі Кастрычніцкай рэвалюцыі.

Наш факультэт ажыццявіў рад мерапрыемстваў па падрыхтоўцы матэрыялаў для універсітэцкай выстаўкі і факультэцкага стэнда, на якіх будуць адлюстраваны дасягненні факультэта за 36 год.

За час работы ў БДУ навуковыя работнікі біёлага-глебавага факультэта апублікавалі рад манаграфій, падручнікаў, вучэбных дапаможнікаў, спецыяльных навуковых артыкулаў. Выдана каля 30 навукова-папулярных брашур, на факультэце абаронена 38 доктарскіх і кандыдацкіх дысертацый, падрыхтавана да абароны—12. Многія работнікі факультэта з'яўляюцца ўдзельнікамі і арганізатарамі раду міжнародных і саюзных навуковых канферэнцый (Р. Н. Годнеў, Н. В. Турбін, Г. Г. Вінберг, Н. А. Дарожкін).

Рад нашых работнікаў актыўна ўдзельнічалі ў баях на франтах грамадзянскай і Айчыннай войн, у партызанскіх атрадах. Гэта Пятровіч, Дарожкін, Калішэвіч, Драко, Палілаў, Воронін, Пенязь, Гладкі, Карташова, Суднік, Папова, Лазавая. Загінулі ў баях за Радзіму дацэнт Дубковіч, асістэнт Вязовіч, аспірант Завістовіч. Многія работнікі факультэта ўзнагароджаны ордэнамі і медалямі, Ганаровымі граматамі і Граматамі Вярхоўнага Совета БССР.

Калектыў работнікаў і студэнтаў біёлага-глебавага факультэта ганарыцца сваімі поспехамі, дасягнутымі за перыяд Совецкай улады, і дастойна сустрэне 40-ую гадавіну Вялікага Кастрычніка.

**М. М. ДРАКО,**
**нам. дэкана біяфака.**

### 40 ГОД НАЗАД

## Старонка барацьбы мінскіх бальшэвікоў за ўладу Советаў у 1917 годзе

У канцы кастрычніка 1917 года контррэвалюцыйныя сілы ў Мінску павялі шалёную атаку на Мінскі Совет, які вёў паслядоўную бальшэвіцкую лінію. Яны імкнуліся выкарыстаць чарговы перавес сіл і пакончыць з Советам-цытадэллю рэвалюцыйнага руху ў Мінску.

У № 18 «Звязды» выдатны кіраўнік мінскіх бальшэвікоў Мяснікоў даў водпаведзь усёй эсэра-меншавіцкай, нацыяналістычнай і контррэвалюцыйнай зграі. Ён пісаў: «На фронце адбываецца рэвалюцыя... Ствараюцца там новыя рэвалюцыйныя камітэты... Рэвалюцыйны фронт возьме і вашу контррэвалюцыйную пазіцыю, якую вы стварылі ў Мінску. Гэта пытанне бліжэйшых дзён».

Ваенна - рэвалюцыйны камітэт II арміі на дапамогу мінскім бальшэвікам вырашыў паслаць бліндзіраваны цягнік. Рэакцыя прымала ўсе меры, каб любымі спробамі затрымаць адпраўку цягніка.

Вось што расказвае былы член Ваенна-рэвалюцыйнага камітэта II арміі бальшэвік В. Пралыгін, які арганізаваў адпраўку цягніка на дапамогу бальшэвікам Мінска:

«Ад начальніка станцыі я патрабаваў даць пуць у бок станцыі Замір'е. Той адмовіў. Тады я заявіў яму:

— Мне пуць не патрэбен, бронецягнік абыйдзецца без вашага пуці. Але папярэдзьце наступную станцыю аб нашым выездзе. Калі-ж нам насустрач будзе пушчан цягнік, дык вашы мінуты жыцця злічаны.

Я ўлез на паравоз, даў свісток і адправіўся. Не маючы пуці, прыйшлося ехаць асцярожна, спыняцца і аглядаць усякае свежае месца насыпу. Рабіць гэта прыходзілася яшчэ і таму, што на шляху нашага следавання знаходзіўся рэакцыйна настроены 10-ы чыгуначны батальён, які мог зрабіць любое паскудства».

На станцыі Залессе, расказаў далей Пралыгін, камендант паведаміў яму, што яго просіць да тэлеграфнага апарата загадчык рухам войск

«Я пайшоў на тэлеграф, — піша В. Пралыгін, — ў суправаджэнні вялікага натоўпу людзей і пры іх вёў перагаворы па праваду».

У ноч з 1 па 2 лістапада бліндзіраваны поезд пад кіраўніцтвам бальшэвіка Пралыгіна прыбыў у Мінск. Ён узяў пад сваю абарону ўвесь горад. Улада поўнасцю перайшла ў рукі Мінскага Совета рабочых і салдацкіх дэпутатаў.

### У СВЕЦЕ НАВУКІ І ТЭХНІКІ

## Шкляны аўтамабіль

*Просты і танны аўтамабіль выпушчаны ў ФРГ заводам Брютш. Аўтамабіль мае трубчатае трохкалёснае шасі. На ім устанаўліваюць розныя па аб'ёму цыліндра і магутнасці бензінавыя маторы з паветраным ахаладжэннем і кузаў са шклянога валакна, скрэпленага пластмасай. Кузавы вырабляюцца ў некалькіх варыянтах — на два або тры месцы і маюць абцякальную яйкавідную форму.*

*Такі аўтамабіль з маторам у 250 кубічных сантыметраў і магутнасцю ў 15 конскіх сіл развівае хуткасць да 100 кіламетраў у гадзіну.*

### Кветка атамнага веку

*У ЗША выдан першы ў свеце патэнт на кветку, выведзеную пры дапамозе атамнай энергіі. Гэта асляпляльна белыя «Анюціны глазкі». Яны паходзяць да звычайных кветак гэтага віду, толькі аблучаных радыёактыўным кобальтам. Выпраменьванні не толькі абясцвецілі кветку; яны выклікалі мутацыю, г. зн. раптоўныя рэзкія змяненні спадчынных уласцівасцяў. У выніку з сямян акрашанай кветкі выраслі расліны з белымі кветкамі.*

*Вывучэннем уздзеяння праменняў на спадчыннасць і выявдзеннем такім чынам новых парод раслін, жывёл і, галоўным чынам, мікраарганізмаў займаецца ўзнікшая за апошнія гады навука—радыёгенетыка.*

### Арыгінальны ратавальны апарат

*Ва Францыі сканструяван новы ратавальны апарат, прызначаны для верхалазаў. Рабочы прычапляе свой засцерагальны пояс за адыходзячы ад шара стальны канат. Пры выпадковым падзенні прыводзіцца ў дзеянне ўмантыраваны ў шар цэнтрабежны тормаз, і чалавек з хуткасцю 2 метры ў секунду плаўна апускаецца на зямлю.*

### КРЫСТАЛ ЦВЯРДЗЕЙ АЛМАЗА

*Супрацоўнік лабараторыі высокіх націскаў амерыканскай фірмы «Джэнерал электрык» атрымаў новы прадукт, названы баразонам, які цвярдзей алмаза: на алмазе ён пакідае царапіны. Баразон валодае яшчэ той перавагай, што вытрымлівае тэмпературу да 1900 градусаў, у той час як алмаз згарае пры 870 градусах.*

### НА КАФЕДРЫ ФІЗІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ І СПОРТУ

Да саракагоддзя Вялікага Кастрычніка кафедра фізічнай культуры і спорту падрыхтавала рад мерапрыемстваў. На ўрачыстым вечары будзе паказана вялікае выступленне лепшых гімнастаў універсітэта. З 13 кастрычніка пачаўся першы круг першынства універсітэта па баскетболу па праграме круглагадзічнай спартакіяды. 20 кастрычніка адбыўся агульнауніверсітэцкі крос, уключаны ў агульную праграму. У пачатку лістапада кафедра фізкультуры і спорту запрашае ў госці валейбалістаў і фехтавальшчыкаў Вільнюскага універсітэта.

**А. ФУРЫКАЎ.**

## Вечар сустрэчы з першакурснікамі





У першакурснікаў у гэты дзень настрой быў вельмі радасны. Усе яны, крыху ўсхваляваныя, сабраліся ў клубе, дзе неўзабаве адбылася сустрэча з іх старэйшымі таварышамі.

Цёпла прайшла ўрачыстая частка. Група дзяўчат вельмі бурна рэагуе, калі дэкану геафака аб'яўляюць падзяку і ўручаюць прызы, заваёваныя спартсменамі факультэта. А вось яны сабраліся ў танцзале і ажыўлена абмяркоўваюць канцэрт мастацкай самадзейнасці, (здымак 1). Руслане Фёдароўскай (другая справа) вельмі спадабалася выступленне філолагаў, асабліва Калядэнкі і Кузьмічэнкі.

Першакурсніцы філфака знаёмяцца з калегамі па вучобе Генадзіем Бураўкіным і Рыгорам Барадуліным і просяць іх прачытаць свае вершы. Гена згадзіўся, і прысутныя з захапленнем слухаюць яго верш пра «дарагую, нецалаваную» (здымак 2).

**Т. ГАКОВА,**
**К. ГРОМАЎ.**

# НАШ СЯБРА—ЛАЎРЭАТ

Варта добра ведаць Рыгора Барадуліна—і адразу беспамылкова адшукаеш яго вершы між другіх. Як і сам Рыгор, яны неспакойныя, парывістыя, поўныя едкай сатыры і добрага беларускага гумару; часам не зусім добра «прычэсаныя», але заўсёды шчырыя, самабытныя. Перагартаеш яго Цалінную нізку: «Кухню Насці», «Над Таболам», «Навальніцу» —і адразу прыпамінаеш, як да самага рання ў ноч пасля прыезду з далёкага Казахстана нам, Нілу Гілевічу і мне, узбуджаны Рыгор апавядаў пра стэп, пра нагрэтую сонцам пшаніцу, пра крывавыя мазалі на далонях і пра беларускія песні пад казахскім небам. Ужо тады нарадзіліся новыя добрыя вершы, і імёна з таго часу пачаўся Рыгор Барадулін як сур'ёзны малады паэт.



З вершамі Рыгора пазнаёміліся мы яшчэ на першым курсе. Цэлы сшытак аддаў ён тады на «рэцэнзію» Нілу Гілевічу. Было ў іх шмат «есенінщчыны», прылізанасці. Але і там, сярод штампаў і напышлівасці, было нямала шчырасці і вобразнасці. Затым Рыгор кінуўся ў другі бок—да літаратуршчыны другога тыпу, калі пад добрую канцоўку падганяўся увесь верш. І толькі ў байках і гумарыстычных творах угадваўся сапраўдны Рыгор з яго нястрыманым тэмпераментам і палкасцю.

І вось—цаліна. Рыгор не раздумваў, ехаць ці не. Усё надзвычайнае, захапляючае заўсёды па душы яму.

...Загучэлі знаёмыя матывы песень, толькі словы да іх былі незвычайнымі: іх на хаду пісаў Рыгор. Без песень і жартаў ён жыць не мог. І як цяжка ні было часам, там, дзе быў Рыгор, гучэў смех.

Свае вершы прысвяціў Рыгор сябрам-цаліннікам. Пра цаліну ў беларускай паэзіі ўжо спрабавалі пісаць, з'явіліся і нядрэнныя творы (напрыклад, вершы Панчанкі). Але шчыра кажучы, іменна ў вершах нашага сябра адчуўся палыновы пах казахскіх стэпаў, рамантыка цалінных будняў. У нейкім сэнсе ён папоўніў новую тэму ў беларускай паэзіі. І галоўнае, вершы былі сапраўды мастацкімі, вобразнымі, з добрым адчуваннем слова і душы чалавечаи.

І калі, будучы на практыцы, я прачытаў у газеце аб прысуджэнні Рыгору Барадуліну другога месца ва Усесаюзным літаратурным фестывальным конкурсе, для мяне гэта не было вялікай нечаканасцю. І не толькі таму, што вершы заслугоўвалі гэтай высокай ацэнкі, а і таму, што Рыгор быў добрым сябрам, гатовым падзяліцца з таварышам апошнім. «Зазнаецца хлапец, да носа і багром не дацягнешся»,—гаварылі часам знаёмыя. Але прыехаў ён зноў у наш інтэрнат, зноў загрымеў у калідорах яго голас— і мы убачылі, што нашы асцярогі былі дарэмнымі: Рыгор застаўся такім-жа простым і шчырым. І новыя вершы яго зноў радуюць вобразнасцю, напружанасцю і добрым гумарам, якім надарыла яго наша родная Полаччына, дзе Рыгор зрабіў свой першы крок і сустрэў першае гарачае каханне.

Пачаўся новы навучальны год, многа новых спраў, новых знаёмстваў, спрэчак прынёс ужо ён. Зноў кожны дзень усё новымі падзеямі і інтарэсамі, новымі задумамі загараецца Рыгор Барадулін — наш лаўрэат, добры і шчыры сябра. І хай яшчэ ў вершах яго і не ўсё так, як хацелася-б нам і самаму Рыгору, але наперадзе ў яго вялікі цікавы шлях з шуканнямі, з роздумамі і сумненнямі і, зразумела, з перамогамі.

Дык «ні пуха ні пяра» табе, сябра і таварыш!

Г. БУРАЎКІН.

# *Вершы Рыгора Барадуліна*

* * *

*Як захлібнуўся ад радасці жаўранак,*
*Славячы сонца вясновага дня,*
*Як па куп'і на балотных выжарынах*
*Мягка хрумсціць пад нагою сушняк;*
*Як па-над ярам пад ветравым подыхам*
*Вольха сухая рыпіць і рыпіць,*
*Як адвячоркам над соннымі водамі*
*Каня ніяк не дапросіцца піць,—*
*Тры гады я не чуў.*
*Як засінелася возера поўнае,*
*Бо маладая красуня-вясна,*
*Каб падсініць хмар касынкі чароўныя,—*
*Сінькі ў ваду сыпанула спаўна;*
*Як палахлівым дзіцём устрывожаным*
*Хмель каля вольхі абвіўся вакол,*
*Як у бары, бо маленькія вожыкі,*
*Шышкі хваёвыя ўсыпалі дол,—*
*Тры гады я не бачыў.*

*Як пад брусістаю шустраю рэчкаю,*
*Пахнуць лілеі, аер і чарот,*
*У першацвет далікатны парэчкавы,*
*У чарназём, што павывернуў крот,—*
*Тры гады не ўдыхаў.*
*Зноўку ступаю знаёмымі сцежкамі,*
*Іх не таптаў тры даўгія гады.*
*Кветкі мне ўслед пазіраюць з усмешкамі,*
*З тымі-ж, з якімі глядзелі тады...*
*І крапіва маладая стрыкаецца,*
*Быццам прыемны, пяшчотны ўспамін.*
*Ем я капусту трыгубую зайцаву,*
*Гладжу змарожаны ліст журавін...*
*Ясны блакіт Вам,*
*прасторы зялёныя!*
*Хай-жа над Вамі з зары да зары*
*Радасна жаўранкі звоняць натхнёныя,*
*Сонца гарыць!*

## ІМЯНІНЫ

Палатка, як шацёр былінны.
Са скрынак зроблен стол адзін.
Спраўляем мы на лад цалінны
Адразу восем імянін.
Ужо дваццаць год, як сёння,
учора
У калысках кіеўлян, мінчан,
Заплакалі вясёлым хорам
Васьмёра юных грамадзян.
І брыгадзір наш весяліцца,
Падносіць ад імя усіх
Поўмісак залатой пшаніцы
Для юбіляраў дарагіх.
На пажаданні не скупіцца—
Гадоў жадае столькі ім,
Як у поўміску ёсць пшаніцы,
А шчасця—колькі ў стэпе усім.
А у хуткім часе, каб не менш,
А роўна столькі як зярнят,
(Што месяцца ў ягонай жмені)
Было сукрыстых немаўлят...
На золку заўтра зноў павінны
На працу выйсці як адзін.
А сёння у нас на лад цалінны
Адразу восем імянін!

* * *

*Ну, восень! Ну, твая пара!*
*Сядзець не можаш без работы.*
*І зноў лінуў ты, як з вядра.*
*Шчырэеш. І няма турботаў.*
*Дождж, запытаць хачу цябе*
*(Мо не ачухаўся спрасоння),*
*Ну што заблажыла табе*
*Пайсці вось менавіта сёння.*
*А дзе-ж ты быў тады, калі*
*Пупышкі ў бэза набракалі...*
*Калі сухмень усё паліў,*
*Калі цябе, як дзень, чакалі...*
*Учора-б ліў да цемнаты.*
*Ліў заўтра з рання і да рання!*
*Як зразумець не можаш ты,*
*Што сёння ў мяне спатканне!*

## ДОБРАЙ РАНІЦЫ!

А птушкі растанне прарочаць.
Зара маладая займаецца.
Кажу я табе:
— Добрай ночы...
Хоць трэба казаць:
—Добрай раніцы!
І вочы ўглядаюцца ў вочы.
Гарэзныя, шчыра усміхаюцца,
І кажуць яны:
— Добрай ночы
Хоць трэба казаць:
— Добрай раніцы.
І рукі разняцца не хочуць.
Мацней яшчэ толькі сціскаюцца.
І кажуць яны:
— Добрай ночы
Хоць трэба казаць-
— Добрай раніцы.
Хоць я не хацеў-бы растання,
Ды дзень хай руплiва
спяшаецца,—
Бо ў сённяшні вечар спатканне
Наблізіць ён нам...
— Добрай раніцы.

* * *

**Світанняў я з табой не сустракаў,**
**Не рассякаў вяслом азёрнай хвалі,**
**І толькі шморгаў носам аб рукаў,**
**Калі цябе да дошкі выклікалі.**
**Здавалася, што бачыць увесь клас,**
**Калі ў твой бок глядзеў я незнарокам.**
**Каб аб сябе напомніць лішні раз,**
**Па пяць заўваг я зарабляў на ўроку.**
**Што стала мне ты нейкаю другой,**
**Баяўся і сабе прызнацца ў гэтым.**
**Ды толькі ўсё чамусьці нас з табой**
**На кніжках плюсавалі без сакрэту.**
**Ну а калі кілометры за два**
**Дамоў з аднавяскоўцамі ішла ты,**
**Як крыўдна мне было, як я злаваў,**
**Што каля самай школы мая хата.**
**...Пранесліся гады, як дзіўны птах.**
**І апынуўся я не ў роднай хаце.**
**З усмешкай палахлівай на губах**
**Я сніў цябе ў студэнцкім інтэрнаце...**
**І вось, нарэшце, на лістах шасці**
**Прызнаўся я табе ў сваім каханні.**
**З трывогай «заказное» апусціў**
**І атрымаў адказ—тваё маўчанне.**
**Дамоў прыехаў.**
**Кажуць, трэці дзень**
**Грыміць тваё вяселле (я-ж не веру).**
**Вянок з гароху хочуць мне надзець**
**Сябры, як адстаўному кавалеру.**
**Хай надзяюць—мне невялікі страх.**
**Я з гора чарку асушу патроху.**
**Што-ж пасядзім з табою мы ў вянках:**
**Твой—з красак палявых,**
**А мой—з гароху...**
**Хай снег гадоў асядзе ў валасах,**
**Хай будзе мне хоць пяць разоў па дваццаць,—**
**Усмешкай палахлівай на губах**
**Ты школьніцай мне будзеш усміхацца...**

# Фізкультура і спорт

## СПАРТЫЎНЫ ТЫДЗЕНЬ



Увесь суботні вечар Гена Кузьмічэнка прымерваў шлём, на якім красавалася эмблема спартыўнага таварыства «Буравеснік». Заўтра раніцою ён з групай матацыклістаў універсітэта адпраўляецца ў мотапрабег, прысвечаны саракавой гадавіне Вялікага Кастрычніка.

Каля біякорпуса сабраліся студэнты. Гэта і праважаючыя, і ўдзельнікі кросу, якія з песняй накіроўваюцца ў парк імя Горкага.

Матацыклісты грэюць маторы. Апошнія хвіліны. Гена Кузьмічэнка яшчэ раз удакладняе з таварышамі маршрут прабегу (здымак № 1). Вось падаецца каманда да адпраўлення. Шчаслівага шляху!



Студэнты едуць у госці да маракоў!

Нядзеля. Раніца. Стаіць цёплае надвор'е.



А у парку імя Горкага у гэты час даецца старт першага забегу дзяўчат на дыстанцыю 800 метраў. Потым у барацьбу уступаюць юнакі. Ім прадстаіць прабяжаць 1500 метраў. Тут мацнейшымі аказваюцца прадстаўнікі каманды фізмата А. Кузнечык, які заняў першае месца з вынікам 4 мін. 24 сек., А. Пранові і Сацункевіч, паказаўшыя вынік 4 мін. 30 сек. (здымак № 2). У камандным заліку першае месца занялі гісторыкі.

Закончыўся першы круг розыгрыша першынства універсітэта па баскетболу. Перамаглі жаночая каманда філфака і мужчынская каманда юрфака, якія прайшлі без паражэнняў. На III здымку вы бачыце момант ля шчыта у сустрэчы каманд філфака і біяфака.

Тэкст А. СПІРЫДОНАВА.
Фота Э. ДАМАРАЦКАГА.

РЭДАКТАР А. ВОЛК.

## АБ'ЯВА

**Студэнты універсітэта, якія пражываюць на прыватных кватэрах, павінны да 10 лістапада прадставіць у прафком заявы на атрыманне платы за кватэру.**

**Студэнты 1-ых курсаў павінны прыкласці да заявы спраўку домакіраўніцтва.**

**Прафком БДУ.**

Адрас рэдакцыі: Мінск, Універсітэцкі гарадок, Біякорпус, 62, тэл. 2-07-19

АТ 01651 Друкарня выдавецтва БДУ. Зак. 1097 Тыраж 2000